# Традиции духовной и материальной культуры пограничья







Учреждение образования
«Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»
Брестская епархия Белорусской Православной Церкви

# ТРАДИЦИИ ДУХОВНОЙ И МАТЕРИАЛЬНОЙ КУЛЬТУРЫ ПОГРАНИЧЬЯ

Сборник материалов
Международной научной конференции

Брест, 15–16 ноября 2016 года

Брест
БрГУ имени А.С. Пушкина
2017

УДК [930.85+271.2-1](1-04)(082)
ББК 63.3(0)я431+71.045я431+86.372-3я431
Т 65

*Рекомендовано редакционно-издательским советом Учреждения образования «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»*

*Рецензенты:*

заведующий отделом народоведения филиала «Институт искусствоведения, этнографии и фольклора имени К. Крапивы» ГНУ «Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси», доктор исторических наук **А.В. Гурко**

заведующий кафедрой истории Беларуси УО «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина», доктор исторических наук **В.В. Зданович**

*Под редакцией*
доктора исторических наук, профессора **А.Н. Вабищевича**

Т 65 **Традиции** духовной и материальной культуры пограничья : сб. материалов Междунар. науч. конф., Брест, 15–16 нояб. 2016 г. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина ; Брест. епархия Белорус. Православ. Церкви ; под ред. А. Н. Вабищевича. – Брест : БрГУ, 2017. – 277 с.
ISBN 978-985-555-745-7.

В материалах сборника изложены результаты исследований авторов – ученых, представителей духовенства, аспирантов и студентов Беларуси, Польши, России, Украины – по отечественной и всеобщей истории, истории Православной Церкви, культурологии, социально-культурной антропологии, архивоведению, источниковедению истории, фольклористике, музееведению, краеведению и др.

Издание адресуется ученым, священно- и церковнослужителям, преподавателям, учителям, обучающимся, работникам учреждений культуры.

**УДК [930.85+271.2-1](1-04)(082)**
**ББК 63.3(0)я431+71.045я431+86.372-3я431**

**ISBN 978-985-555-745-7**

© УО «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина», 2017

# ДОКЛАДЫ ПЛЕНАРНОГО ЗАСЕДАНИЯ

УДК 008(476)(091)

**А.М. Вабішчэвіч**
Рэспубліка Беларусь, г. Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна

## СПАДЧЫНА ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ Ў ГІСТОРЫІ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

У гістарычнай адукацыі вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь важнае значэнне набывае засваенне будучымі спецыялістамі дасягненняў айчыннай культуры. Гэта ажыццяўляецца як у ходзе вывучэння такіх прадметаў, як "Гісторыя Беларусі", "Гісторыя ўсходніх славян" ("Гісторыя Расіі і Украіны"), так і спецыяльных гістарычных, культуралагічных дысцыплін, сярод якіх трэба адзначыць курс "Гісторыя культуры Беларусі". Уласны шматгадовы вопыт яе выкладання на гістарычным факультэце БрДУ імя А.С. Пушкіна паказвае значнасць атрымання студэнтамі цэласнага комплексу ведаў аб гісторыі айчыннай культуры ў кантэксце рэгіянальнага (усходнееўрапейскага), кантынентальнага (еўрапейскага) і сусветнага культурнага жыцця. Састаўной іх часткай з'яўляюцца веды аб гісторыка-культурнай спадчыне Праваслаўнай Царквы, якія набываюцца студэнтамі як на лекцыйных і семінарскіх занятках, так і ў ходзе самастойнай працы з матэрыяламі выдадзенага вучэбна-метадычнага комплекса [1], прапанаванай літаратуры і карысных сайтаў.

Вытокі культуры ўсходнеславянскіх народаў якраз звязаны з хрышчэннем Русі князем Уладзімірам Святаславічам у 988 г. З канца X – пачатку XI ст. хрысціянства візантыйскага абраду пачало распаўсюджвацца на тэрыторыі сучаснай Беларусі. У 992 г. была створана Полацкая епархія. Прыняцце і распаўсюджванне хрысціянства разглядаецца ў тэме "Культура беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст.". Па меры распаўсюджвання хрысціянства ў Полацкім і Тураўскім княствах узводзіліся цэрквы, адкрываліся манастыры. Візантыйская культура характарызавалася магутным росквітам у XI–XII стст. Наноў перапрацаваўшы традыцыі старажытнага Рыма і Грэцыі, Візантыя стала мастком паміж антычнасцю і культурай сярэднявечча, Новага часу Еўропы, моцным сусветным цэнтрам культуры. Прыняцце і распаўсюджванне хрысціянства аказала велізарны ўплыў на культуру ўсходнеславянскага насельніцтва. Адзначаюцца такія дасягненні, як з'яўленне пісьменнасці, што садзейнічала пашырэнню твораў пісьменства, пачатку летапісання і інш., асвета (школы пры манастырах і інш.), мураванае культавае дойлідства (крыжова-купальны тып храмаў), іканапіс, фрэскі, новыя мастацкія тэхналогіі, хрысціянскія маральна-этычныя каштоўнасці [1, с. 25]. Для навучэнцаў падкрэсліваецца, што творчае засваенне візантыйскай спадчыны паспрыяла самастойнаму, выніковаму культурнаму развіццю ўсходніх славян. "Славянскія народы не былі правінцыяльнымі самавучкамі, абмежаванымі мясцовымі

інтарэсамі і мясцовымі традыцыямі, – адзначаў акадэмік Д.С. Ліхачоў. – Праз Візантыю і іншыя краіны яны дыхалі паветрам сусветнай культуры” [2, с. 82]. Гэтая цытата, уключаная ў тэкст лекцыі, вельмі трапна адлюстроўвае месца ўсходнеславянскіх народаў у кантэксце сусветнай культуры.

На занятках студэнты не толькі атрымліваюць звесткі пра самыя старажытныя кнігі, але маюць магчымасць азнаёміцца з факсімільнымі выданнямі помнікаў кніжнай культуры, напрыклад з Тураўскім Евангеллем XI ст. [3]. Таксама выкарыстоўваюцца творы са спадчыны К. Тураўскага, які праславіўся як прапаведнік, выдатны майстар красамоўства на Русі і якога параўноўвалі з візантыйскім царкоўным дзеячам І. Златавустам. Творчасць К. Тураўскага набыла вялікую папулярнасць на ўсходнеславянскіх землях і аказала істотны ўплыў на развіццё аратарскай прозы. Ён пісаў на старaславянскай мове, для яго стылю характэрна ўскладненасць і ўрачыстасць, высокамастацкае майстэрства выкладання матэрыялу. Для прыкладу зачытваюцца асобныя творы (“словы”-казанні, прытчы, каноны) ці іх урыўкі. Важна, каб студэнты зразумелі, што творы К. Тураўскага складаюць залаты фонд старажытнаславянскай літаратуры. На працягу стагоддзяў яны карысталіся вялікай папулярнасцю на ўсходнеславянскіх землях, распаўсюджваліся ў спісах XII–XVII стст. Творчасць К. Тураўскага аказала ўплыў на развіццё духоўнасці і мастацкай культуры на Беларусі.

Прыняцце і распаўсюджванне хрысціянства паклала пачатак на беларускіх землях мураванаму манументальнаму дойлідству. З выкарыстаннем разнастайнага ілюстрацыйнага, графічнага матэрыялу студэнты засвойваюць адметныя мастацкія рысы і тэхналогіі будаўніцтва полацкай і гродзенскай архітэктурных школ, асобных помнікаў дойлідства.

У фарміраванні цэласнага ўяўлення пра гісторыю культуры іграе ролю засваенне асобаснага фактару (аб ролі дзеячаў, творцаў, мысліцеляў, асветнікаў). Для гэтага па кожнай тэме прапанаваны імянны слоўнік з актуальнай біяграфічнай інфармацыяй. Сярод дзеячаў старажытнарускага перыяду вылучаны Аўрамій Смаленскі (Працалюбівы), Еўфрасіння (Ефрасіння) Полацкая, Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч.

У тэме “Культура беларускіх зямель у другой палове XIII–XV ст.” падкрэсліваецца, што тагачаснае культурнае жыццё было цесна звязана з Праваслаўнай Царквой, са старажытнымі ўсходнеславянскімі традыцыямі, каштоўнасцямі візантыйскай і старажытнарускай культур [1, с. 37]. Буйныя праваслаўныя манастыры і храмы з’яўляліся цэнтрамі кніжнай пісьменнасці. Сярод шэдэўраў старажытнабеларускіх рукапісных кніг другой паловы XIII – XV ст. вывучаюцца Друцкае, Лаўрышаўскае, Мсціжскае, Жыровіцкае Евангеллі, Смаленскі (Анежскі) Псалтыр. Значны ўклад у пісьменнасць у другой палове XIV – XV ст. унеслі выхадцы з паўднёваславянскіх зямель – мітрапаліты Кіпрыян і Грыгорый І Цамблак. Сярод нешматлікіх дзеячаў той эпохі вылучаецца Елісей Лаўрышаўскі, заснавальнік і першы ігумен Лаўрышаўскага манастыра каля Навагрудка. Пры вывучэнні асаблівасцей дойлідства на беларускіх землях у разглядаемы перыяд звяртаецца ўвага на выпрацоўку

ўласнага стылявога напрамку ў архітэктуры XV – першай трэці XVI ст. – беларускай готыкі, якая гарманічна спалучала рысы готыкі і рэнесансу, традыцыі візантыйскага і старажытнарускага дойлідства, што надало мясцовым архітэктурным помнікам непаўторны каларыт і мастацкую каштоўнасць. Гэта прасочваецца на прыкладзе цэркваў-крэпасцей у Супраслі, Сынкавічах, Мураванцы. Традыцыі візантыйскага і старажытнарускага мастацтва захоўваліся ў развіцці іканапісу ў XIV–XV стст. (ікона "Маці Боская Замілаванне" з Мікаласеўскай царквы ў Маларыце, выкананая афінскім жывапісцам Н. Ламбудзісам, і інш.).

У ходзе вывучэння тэмы "Культура эпохі Адраджэння і Рэфармацыі на Беларусі (XVI ст.)" раскрыты пытанні нараджэння кнігадрукавання, развіцця літаратуры і мастацкай культуры [1, с. 47–53]. Выкарыстоўваючы факсімільныя выданні, студэнты знаёмяцца з Бібліяй Ф. Скарыны. Кнігадрукарская традыцыя прасочваецца на прыкладзе дзейнасці І. Фёдарава, П. Мсціслаўца, В. Цяпінскага. Асаблівая ўвага звернута на асобу праваслаўнага магната, мецэната і грамадскага дзеяча К. Астрожскага. Для гэтага выкарыстоўваюцца матэрыялы навукова-багаслоўскай канферэнцыі, якая праводзілася ў БрДУ імя А.С. Пушкіна ў 2008 г. [4]. У XVI ст. пад уплывам ідэй Адраджэння на аснове традыцый візантыйскага і старажытнарускага мастацтва склалася самабытная беларуская іканапісная школа. На семінарскіх занятках студэнты выдзяляюць асаблівасці манеры выканання, адметнасці мясцовых іканапісных школ Брэстчыны, Віцебшчыны, Магілёўшчыны. Пры дапамозе альбомаў, мультымедыйных матэрыялаў яны знаёмяцца з выдатнымі ўзорамі іканапісу XVI ст. – іконамі "Маці Боская Адзігітрыя Іерусалімская" з Варварынскай царквы ў Пінску, "Маці Боская Смаленская" (в. Дубянец Столінскага раёна), "Знаменне" (в. Імянін Драгічынскага раёна), "Маці Боская Адзігітрыя Іерусалімская" (в. Здзітава Жабінкаўскага раёна), "Хрыстос Уседзяржыцель" (в. Быцень Івацэвіцкага раёна) і інш.

Змястоўны матэрыял па гісторыі Праваслаўнай Царквы ўтрымліваецца ў тэме "Культура Контррэфармацыі і барока. Асветніцтва на Беларусі" [1, с. 58–68]. У сувязі з царкоўнай палемікай вакол пытанняў аб прыняцці Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. праваслаўныя пісьменнікі Лявонцій Карповіч, Стэфан і Лаўрэнцій Зізаніі, Св. Афанасій Брэсцкі і інш. часткова адрадзілі ў сваіх творах лепшыя традыцыі царкоўнаславянскага пісьменства. Пакінуў пасля сябе шмат твораў Георгій Каніскі, які самаадданa адстойваў правы праваслаўнага насельніцтва ў сярэдзіне – другой палове XVIII ст. Важную ролю ў супрацьдзеянні паланізацыі, абароне рэлігійных і культурных інтарэсаў беларускага насельніцтва сыгралі праваслаўныя брацтвы, пры якіх у канцы XVI – XVIII ст. ствараліся праваслаўныя брацкія школы. Першымі з іх былі брацкія школы ў Вільні (каля 1584 г.), Магілёве (1590), Брэсце (1591), Мінску (1612). Сярод вядомых вучэбных выданняў адзначаюцца "Граматыка славенская..." (1596) Лаўрэція Зізанія, "Граматыкі славенскія правільна сінтагма..." (1618–1619) Мялеція Сматрыцкага, "Буквар" (1631) Спірыдона Собаля і інш. Адметнай з'явай у літаратуры ўсходнеславянскіх народаў была асветніцкая і паэтычная

дзейнасць Сімяона Полацкага. Яго пасмяротныя зборнікі "Вертаград мнагацветны" і "Рыфмалагіён, ці Вершаслоў" (1681) сталі настольнымі кнігамі адукаваных людзей і творцаў.

У межах тэмы "Культура беларускіх зямель у канцы XVIII – XIX ст." разглядаюцца працэсы, якія разгортваліся ў культурным жыцці ў складзе Расійскай імперыі [1, с. 74–82]. У канцы XVIII – першай палове XIX ст. у архітэктуры Беларусі пануючым становіцца стыль класіцызм (разам з ампірам, рысамі рамантызму), з сярэдзіны XIX ст. пашыраецца эклектызм, гістарызм (перайманне гістарычных стыляў мінулага – неаготыка, неакласіцызм, неабарока і інш.), мадэрн. Пры гэтым прасочваецца эвалюцыя царкоўнага будаўніцтва. Сярод значных пабудоў класіцызму канца XVIII – першай паловы XIX ст. адзначаецца Іосіфаўскі сабор у Магілёве, які не захаваўся. Адметнасці класіцызму асабліва яскрава адлюстраваны ў архітэктуры Гомеля. Менавіта там у пачатку XIX ст. архітэктар Дж. Кларк перабудаваў палац, спраектаваў фактычна ўсю архітэктуру гэтага горада. Менавіта паводле яго праекта ў стылі класіцызму ў Гомелі быў пабудаваны ў 1809–1819 гг. Петрапаўлаўскі сабор. Навучэнцам адзначаецца, што ў культавым дойлідстве ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. яшчэ захоўваліся рысы барока і ракако. Адным з самых яскравых прыкладаў палескай школы драўлянага дойлідства ў стылі барока з'яўляецца Рубельская Свята-Міхайлаўская царква (1796) у Столінскім раёне. А з сярэдзіны XIX ст. у праваслаўным царкоўным будаўніцтве пачалі выкарыстоўваць традыцыі рускага дойлідства XVII ст. (руска-візантыйскі стыль), што было звязана з пошукамі самабытнасці архітэктуры ў Расіі. У псеўдарускім стылі былі ўзведзены многія праваслаўныя цэрквы на беларускіх землях, сярод іх Сімяонаўская царква ў Брэсце (1865). Адметнасцю з'яўлялася і тое, што былыя ўніяцкія і каталіцкія храмы перабудоўваліся ў праваслаўныя цэрквы.

Рэлігійныя сюжэты былі пашыранымі ў творчасці мастакоў. У прыватнасці, Нікадзім Сілівановіч працаваў у бытавым і партрэтным жанрах, іканапісе. Ён удзельнічаў у стварэнні мазаічнай кампазіцыі "Тайная вячэра" для галоўнага іканастаса Ісакіеўскага сабора ў Пецярбургу. У сакральным жывапісе была вялікая прысутнасць класіцызму ў яго акадэмічным варыянце, што звязана з працай на беларускіх землях прафесійных жывапісцаў, якія былі выхаванцамі Віленскага ўніверсітэта, Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, Маскоўскага вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства. Нягледзячы на супярэчлівыя ўмовы развіцця, захавала сваю ўстойлівасць палеская школа жывапісу. Студэнты прасочваюць гэта пры дапамозе рэпрадукцый з альбомаў па беларускім іканапісе.

Пры вывучэнні тэмы "Культура Беларусі ў пачатку XX ст." таксама немалое значэнне надаецца культавай (праваслаўнай) архітэктуры. Сярод шэрагу помнікаў асобна вылучаны царква Аляксандра Неўскага ў Мінску і Свята-Мікалаеўская брацкая царква ў Брэсце. Царква А. Неўскага ў Мінску, якая знаходзіцца на Вайсковых могілках, – помнік рэтраспектыўна-рускага стылю. Пабудавана ў 1896–1898 гг. з цэглы паводле праекта архітэктара В. Струева ў гонар перамогі рускіх войск у руска-турэцкай вайне 1877–1878 гг. Да 1910 г.

належала ваеннаму ведамству. Пры ўваходзе ў прытворы размешчаны мемарыяльныя дошкі з імёнамі 118 воінаў-беларусаў 30-й артылерыйскай брыгады і 119-га Каломенскага палка, якія гераічна загінулі пад Плеўнай (Балгарыя). У царкве захоўваюцца ваенныя рэліквіі (сцяг палка), за алтарнай сцяной былі пахаванні вышэйшых афіцэрскіх чыноў, дзве брацкія магілы воінаў. Свята-Мікалаеўская брацкая царква ў Брэсце была ўзведзена ў 1904–1906 гг. у руска-візантыйскім стылі з элементамі маскоўскага царкоўнага дойлідства XVII ст. Аўтарам праекта быў гродзенскі губернскі архітэктар І. Плотнікаў. Будаўніцтва вялося на ахвяраванні маракоў і афіцэраў, удзельнікаў руска-японскай вайны, якія лічылі свяціцеля Мікалая сваім апекуном, і на сродкі брацтва ў гонар свяціцеля Мікалая і Афанасія Брэсцкага [5, с. 26, 131].

Трагічны лёс праваслаўнай спадчыны разглядаецца ў межах тэмы "Культурнае жыццё ў БССР у 20–30-я гг. XX ст.". Атэістычная палітыка пачалася з першых дзён савецкай улады. Канфіскацыя царкоўных каштоўнасцей, фізічнае праследаванне святароў нанеслі моцны ўдар па Праваслаўнай Царкве. Тады былі страчаны значныя помнікі культавай архітэктуры. Сярод іх быў Свята-Іосіфаўскі сабор у Магілёве, узведзены ў стылі класіцызму па праекце М. Львова ў 1780–1798 гг. У закрытым саборы ў 1932–1937 гг. размяшчаўся музей гісторыі рэлігіі і атэізму. У 1937 г. Свята-Іосіфаўскі сабор быў разбураны [5, с. 262].

У іншай тэме – "Культура Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг." – закранута складанае становішча Праваслаўнай Царквы ў Польскай дзяржаве. Пэўная ўвага звернута на грамадска-культурнае жыццё праваслаўнага насельніцтва (беларусаў, рускіх, украінцаў і інш.) у заходнебеларускім рэгіёне. Так, пры характарыстыцы становішча рускай супольнасці выкладзены матэрыял пра яе грамадскія і царкоўныя структуры, што клапаціліся пра захаванне духоўнай спадчыны. Так, пры аддзелах Рускага дабрачыннага таварыства (РДТ) у Брэсце, Пінску, Лунінцы, Гродне, Навагрудку, Баранавічах, Стоўбцах, Слоніме, Верцялішках Гродзенскага павета, Дабромыслі і Новай Мышы Баранавіцкага павета гуртавалася мясцовая руская інтэлігенцыя, ствараліся літаратурныя, тэатральныя гурткі і іншыя творчыя аб'яднанні. Аддзелы РДТ займаліся ўтрыманнем адзінкавых рускіх школ, бібліятэк, правядзеннем культурна-асветніцкай працы. Наладжваліся Дні рускай культуры, розныя юбілейныя ўрачыстасці. Акрамя свецкіх рускамоўных газет "Русский голос", "Наше время", "Новая искра", "Русское слово", што выдаваліся ў міжваеннай Польшчы, распаўсюджвалася і праваслаўная перыёдыка – часопіс "Воскресное чтение", газета "Слово" і інш. [1, с. 121].

У наступнай тэме – "Культурнае жыццё ў БССР у 1940–1980-я гг." – раскрываюцца асноўныя напрамкі савецкай атэістычнай палітыкі ў рэспубліцы. Ваяўнічы характар яна мела ў час "хрушчоўскай адлігі" ў другой палове 1950-х – першай палове 1960-х гг. Незваротна былі страчаны каштоўныя помнікі праваслаўнай архітэктуры. У 1950–1960-я гг. горадаўтваральную ролю замест гістарычных цэнтраў з помнікамі старажытнага дойлідства (у тым ліку і цэрквамі) узялі на сябе архітэктурныя ансамблі ў стылі неакласіцызму. Сярод

шэрагу страчаных у той час помнікаў архітэктуры трэба адзначыць знесеную ў 1961 г. Дабравешчанскую царкву XII ст. у Віцебску.

Адраджэнне духоўнасці, традыцый Праваслаўнай Царквы пачалося з канца 1980-х гг. Гэта ўсё ўжо вывучаецца ў тэме "Сучаснае культурнае жыццё Беларусі". Падкрэслены значны ўклад рэлігійных аб'яднанняў і Праваслаўнай Царквы, у прыватнасці, у зберажэнне духоўнасці і маральнасці ў краіне. Традыцыйным з 1994 г. ужо стала рэспубліканскае свята "Дзень беларускага пісьменства". Штогод яно наладжваецца ў горадзе з багатай гісторыка-культурнай спадчынай. Геаграфія яго правядзення ахоплівае ўсе рэгіёны Беларусі – Полацк, Тураў, Навагрудак, Нясвіж, Орша, Пінск, Заслаўе, Мсціслаў, Мір, Камянец, Паставы, Шклоў, Барысаў, Смаргонь, Хойнікі, Ганцавічы, Глыбокае, Быхаў, Шчучын, Рагачоў.

Сярод найбольш значных праектаў па аднаўленні мастацкай спадчыны адзначаюцца творы М. Кузьміча, прызванага "Лазарам Богшам з Брэста", па аднаўленні крыжа Е. Полацкай 1161 г. (1997), ракі для захавання яе мошчаў (2007); рэстаўрацыі У. Ракіцкім, Ю. Маліноўскім і іншымі майстрамі фрэсак XII ст. Спаса-Праабражэнскай царквы ў Полацку. З'явіліся факсімільныя выданні Тураўскага Евангелля XI ст., Слуцкага Евангелля XVI ст. і іншых кніжных фаліянтаў. На семінарскіх занятках у студэнтаў ёсць магчымасць пазнаёміцца з гэтымі факсімільнымі выданнямі.

Праваслаўная спадчына закранута і пры асвятленні пытання аб рэстаўрацыі помнікаў дойлідства на сучасным этапе. Былі праведзены рэстаўрацыйна-аднаўленчыя працы на многіх знакавых аб'ектах архітэктуры Беларусі. У вучэбна-метадычным комплексе прыведзена інфармацыя за 2015 г., калі рэстаўрацыйныя працы праводзіліся на такіх значных помніках, як Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку, Свята-Пакроўскі сабор у Талачыне і інш.

Тэма "Культура беларускага замежжа" прысвечана гісторыі беларускай дыяспары, якая назапасіла багаты вопыт захавання роднай мовы, культуры, нацыянальнай самабытнасці, унесла свой уклад у папулярызацыю беларускай культуры, літаратуры, мастацтва, а таксама зберагала рэлігійныя каштоўнасці. Гэтаму садзейнічалі створаныя ў замежжы працай і самаахвярнасцю многіх беларусаў грамадскія, культурна-асветніцкія, навуковыя, рэлігійныя арганізацыі, суполкі мастакоў, нацыянальны друк і асвета, культурныя цэнтры, музеі і архівы, мастацкія калектывы, пабудаваныя храмы. Адзначаюцца такія праваслаўныя храмы ў ЗША: кафедральны сабор Св. К. Тураўскага ў Нью-Ёрку, у Саўт-Рыверы ў 1972 г. была пабудавана царква Св. Е. Полацкай, існавалі беларускія праваслаўныя прыходы ў шэрагу іншых гарадоў. Прыводзяцца прыклады ахвяраванняў з боку беларусаў замежжа. Напрыклад, беларусы Сібіры А. Сілівончык, М. Сулкоўскі і наш суайчыннік А. Лук'янчык з ЗША аказвалі фінансавую дапамогу ў стварэнні копіі нацыянальнай каштоўнасці – крыжа Е. Полацкай – Спаса-Ефрасіннеўскаму манастыру ў Полацку.

У цэлым у межах курса "Гісторыя культуры Беларусі" ў навучэнцаў ёсць магчымасць засвоіць неабходныя веды па матэрыяльнай і культурнай спадчыне, звязанай з дзейнасцю Праваслаўнай Царквы на тэрыторыі Беларусі. Даволі

змястоўны масіў вывучанага гісторыка-культуралагічнага матэрыялу з'яўляецца добрай падставай для выхавання ў будучых спецыялістаў-гісторыкаў гуманістычнага светапогляду, станоўчых дзелавых і маральных якасцей.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Вабішчэвіч, А.М. Гісторыя культуры Беларусі : вучэб.-метад. комплекс / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : БрДУ, 2016. – 194 с.

2. Лихачев, Д. С. Раздумья / Д. С. Лихачев. – М. : Дет. лит., 1991. – 318 с.

3. Тураўскае Евангелле = Туровское Евангелие = Turaŭ Gospel : факс. узнаўленне, даследаванні. – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2014. – 187 с.

4. Дабраверны князь Канстанцін (Васілій) Астрожскі – славуты асветнік і абаронца Праваслаўя : зб. матэрыялаў Міжнар. навук.-багасл. канф., Тураў – Брэст, 11–12 мая 2008 г. / рэдкал.: М. Э. Часноўскі [і інш.]. – Брэст : БрДУ, 2011. – 208 с.

5. Кулагін, А. М. Праваслаўныя храмы на Беларусі : энцыкл. давед. / А. М. Кулагін. – Мінск : БелЭн, 2001. – 328 с.

УДК 008(438+476)

**Jerzy Nikitorowicz**
Polska, Białystok, Uniwersytet w Białymstoku

## SPECYFIKA WSCHODNIEGO POGRANICZA POLSKI I ZACHODNIEGO BIAŁORUSI W KONTEKŚCIE KSZTAŁTOWANIA SIĄ CZŁOWIEKA POGRANICZA

Wskazując na specyfikę naszego pogranicza chciałbym zwrócić uwagę na relacje trzech czynników: czasu, przestrzeni i miejsca. Uważam, ze one decydują o kształtowaniu się człowieka pogranicza, wartościach, zasadach i wzorcach uznawanych, poczuciu bezpieczeństwa, zakorzenienia, ufności, wiary w ciągłość i jasność ustawicznie kształtującej się tożsamości, na co zwracał uwagę między innymi Antony Giddens [1]. Uważam, że „Nieuprawianie terenu „pomiędzy" dopuszcza instrumentalne traktowanie kwestii kultury (i kultur), ignorancję i powrót do kategorii zużytych, „przeterminowanych" i z tego powodu szkodliwych" [2, s. 13]. Stąd, obowiązkiem pracowników akademickich jest znajomość specyfiki pogranicza na którym funkcjonują, prowadzą badania i kształtują postawy młodzieży (równoważą emocje, przekazują wiedzę na temat innych kultur, kształtują kompetencje międzykulturowe, organizują działalność edukacyjną na rzecz wzajemnego poznania, zrozumienia, współpracy i współdziałania). Takie postawy przeciwstawiają się uprzedzeniom, negatywnym stereotypom, megalomanii i ksenofobii, wzajemnym oskarżeniom, lękom o bezpieczeństwo kulturowe i pozwalają na otwarte kształtowanie tożsamości, korzystanie z wzajemnych zapożyczeń ubogacających tożsamość jednostkową i zbiorową, kształtują poczucie wartości bycia „pogranicznego".

Chciałbym zauważyć, że to ośrodki akademickie odpowiadają za kreowanie rozwoju kultury i innowacji aby nie dopuścić do narastania kultury upokorzenia, utraty